ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 34 (867) ● ЧАЦВЕР, 30 лістапада 1972 г. Цана 2 кап. ● Год выдання XXVI

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

● ДА 50-ГОДДЗЯ УТВАРЭННЯ СССР ● НДІ ПФП НАБІРАЕ СІЛЫ ● АГЛЯД НАСЦЕННАГА ДРУКУ ● ТВАЕ ВЫКЛАДЧЫКІ, СТУДЭНТ ● У КАЛЕКТЫВАХ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ● СПОРТ

## НДІ ПФП: вынікі працы і перспектывы

У прынятай нядаўна пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне» вялікая ўвага ўдзяляецца развіццю навуковых даследаванняў. Навуковыя ўстановы вышэйшай школы павінны стаяць на перадавых пазіцыях сучаснай навукі, пашыраць фронт і ўдасканальваць формы і арганізацыю навуковых даследаванняў, ставіць комплексныя праблемы па найбольш актуальных раздзелах навукі і тэхнікі, даводзіць атрыманыя вынікі да стадыі ўкаранення. Такія задачы па плячу вырашаць толькі вялікаму калектыву, абапіраючыся на магутную эксперыментальную базу. Задавальняць усе гэтыя патрабаванні—першачарговая задача і прамы абавязак калектыву супрацоўнікаў інстытута прыкладных фізічных праблем.

Ідэя стварэння першага ў рэспубліцы навукова-даследчага інстытута пры вышэйшай навучальнай установе ўзнікла пяць год таму назад. Гэтаму папярэднічала знаёмства са станоўчым вопытам работы падобных навуковых устаноў пры іншых вну краіны. Ініцыятарам стварэння і станаўлення такой арганізацыі пры нашым універсітэце і яе кіраўніком стаў акадэмік АН БССР прафесар А. Н. Сеўчанка.

Аднак для таго, каб ажыццявіць задуму, неабходны былі хоць тры аб'ектыўныя перадумовы: наяўнасць ядра высокакваліфікаваных спецыялістаў, актуальнасць распрацоўваемай імі тэматыкі, дастаткова развітая матэрыяльна-тэхнічная база.

Закладцы такога фундамента фактычна і былі прысвечаны ўсе гады дзейнасці навукова-даследчых лабараторый фізічнага профілю нашага універсітэта.

У выніку праведзенага комплексу мерапрыемстваў па пашырэнню тэматыкі, прыцягненню да навуковай дзейнасці найбольш здольных выпускнікоў універсітэта, забеспячэнню лабараторый сучасным абсталяваннем і г. д. к сярэдзіне 1970 года склаліся аб'ектыўныя ўмовы, якія дазволілі паставіць пытанне аб аб'яднанні праблемнай лабараторыі паўправадніковай тэхнікі, навукова-даследчых лабараторый спектраскапіі і фізічнай электронікі і спецлабараторыі пры кафедры ядзернай фізікі ў асобную самастойную арганізацыю—інстытут прыкладных фізічных праблем пры БДУ імя У. І. Леніна. Гэтая прапанова была адобрана калегіямі МВ і ССА БССР і СССР, а таксама аддзяленнем агульнай фізікі і астраноміі АН СССР. Калегія Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў СССР па навуцы і тэхніцы прыняла 22 снежня 1970 года пастанову аб арганізацыі НДІ ПФП БДУ, у якой, у прыватнасці, былі вызначаны асноўныя напрамкі яго дзейнасці ў галіне оптыкі і спектраскапіі, фізікі цвёрдага цела і паўправадніко, радыёэлектронікі і прыборабудавання.

Апошнія два гады былі гадамі станаўлення і развіцця нашага інстытута. Цяпер ужо ўпэўнена можна сказаць, што ён трывала стаў на ногі. Здадзен у эксплуатацыю ва ўрочышчы Шчамысліца Мінскага раёна адміністрацыйна-вытворчы корпус агульнай плошчай амаль 7 тыс. кв. м., будуецца там жа яшчэ адзін, 9-паверховы корпус карыснай плошчай 15,5 тыс. кв. м і 14-павярховы жылы дом для маладых супрацоўнікаў і аспірантаў на 216 кватэр. Вырашана праблема дастаўкі супрацоўнікаў да месца работы і назад, заканчваецца будаўніцтва асфальтаванай пешаходнай дарогі, абсталяванне сталовай павышанага разраду на 100 пасадачных месц і двухзменнага буфета з магазінам паўфабрыкатаў.

Створаны і актыўа ўключыліся ў работу грамадскія арганізацыі інстытута, пачынаюць дзейнічаць філасофскі і навуковы семінары. Наладжана матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне, арганізаван склад матэрыяльных каштоўнасцей, хімсклад, зманціравана і дзейнічае ўнутраная АТС на 30 нумароў. Толькі па дзяржбюджэту закуплена абсталявання на 195 тыс. рублёў і матэрыялаў амаль на 150 тыс. рублёў. Савет Міністраў БССР выдзеліў для універсітэта, у тым ліку і для інстытута, сродкі для набыцця з міжнароднай выстаўкі «Спектр-72» некалькіх унікальных аптычных прыбораў, што дазволіла разгарнуць даследаванні на прынцыпова новай аснове і пашырыць кола рашаемых задач.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

## СТВОРАНА ПЕДАГАГІЧНАЕ ТАВАРЫСТВА БССР

Па рашэнню ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР у нашай рэспубліцы створана Педагагічнае таварыства. Яму адведзена значная роля ў выкананні пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб школе і тых вялікіх планаў, якія вызначаны Міністэрствам асветы БССР па яе рэалізацыі. Таварыства павінна прапагандаваць і растлумачваць важнасць усенавуча сярод шырокіх мас, арганізаваць работу па вывучэнню передавога вопыту ў гэтым напрамку, вырашаць і іншыя задачы.

Цэнтральны Камітэт КПБ паставіў перад таварыствам дакладную задачу: «садзейнічаць развіццю педагагічнай навукі, умацаванню сувязі з практыкай, паляпшэнню прапаганды даследаванняў савецкай педагогікі сярод шырокай грамадскасці, аказанню членам таварыства дапамогі ў пашырэнні і паляпшэнні іх спецыяльных ведаў, павышэнню навукова-тэарэтычнага ўзроўню».

27 — 28 лістапада на базе БДУ адбыўся ўстаноўчы з'езд таварыства, на якім быў прынят статут, распрацаваны аргкамісіяй на чале са старшынёй, членам-карэспандэнтам АПН СССР, прарэктарам па вучэбнай рабоце БДУ, прафесарам С. А. Умрэйкам. З'езд выбраў савет, які прыступіць да стварэння абласных, гарадскіх, раённых і пярвічных арганізацый таварыства.

**Л. ДРУЗЕВА.**



## МЕДАЛІ АКАДЭМІІ НАВУК СССР—СТУДЭНТАМ

З мэтай далейшага павышэння актыўнасці студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў у правядзенні навуковых даследаванняў Прэзідыум Акадэміі навук СССР зацвердзіў палажэнне аб медалях АН СССР з прэміямі для студэнтаў пры секцыі Прэзідыума АН вну за лепшыя навуковыя работы і ўвёў іх прысуджэнне з 1972 года.

Адпаведна палажэнню Акадэмія навук СССР штогод у верасні будзе прысуджаць студэнтам вну за лепшыя навуковыя работы ў галіне прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навук 5 медаляў з прэміямі ў памеры 200 рублёў кожная.

На атрыманне медаляў з прэміямі могуць быць прадміямі праводзяцца экспертнымі камісіямі, створанымі стаўлены работы або серыі работ адзінай тэматыкі, як правіла, асобных аўтараў. Пры прадстаўленні калектыўных работ указваюцца толькі вядучыя аўтары, але не больш трох чалавек.

Навуковая адзнака работ, якія паступаюць ад конкурсных камісій МВ і ССА і ЦК ВЛКСМ, і рэкамендацыі кандыдатаў для прысуджэння медаляў АН СССР з прэ- СССР з ліку вядучых вучоных з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі і Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ.

Студэнты, удастоеныя медаляў з прэміямі, маюць права пры друкаванні работ адзначыць у загалоўку: «Удастоена медалі Акадэміі навук СССР за лепшую студэнцкую работу за ... год».

Асобам, удастоеным медалі АН СССР з прэміяй, выдаецца дыплом устаноўленага ўзору.





*НА ЗДЫМКАХ: практычныя заняткі па стылістыцы ў студэнтаў IV курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта. Іх вядзе выкладчыца Н. І. ГІЛЕВІЧ.*

*Фота Д. Чаховіча.*

ВЕСТКІ З ЖУРФАКА

## СУСТРЭЧА З АЎТАРАМ

Выйшла кніга Д. М. Смірнова «Запіскі чэкіста». А на днях Дзмітрый Міхайлавіч пабываў у гасцях у студэнтаў журфака. З вялікім інтарэсам слухалі будучыя журналісты расказ госця аб сваім жыцці, які шаснаццацігадовым юнаком прыйшоў у органы ЧК.

Д. М. Смірноў на пенсіі. Але і цяпер ён працягвае справу выхавання моладзі.

**Н. КУРНЯНКОВА,**
**А. СЦЯПАНАВА.**

## Экскурсія ў выдавецтва БелСЭ

Пад кіраўніцтвам ст. выкладчыцы тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі Т. Д. Арловай студэнты І курса факультэта журналістыкі наведалі выдавецтва Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Яны пабывалі ў многіх яго рэдакцыях: гісторыі БССР і археалогіі, біялогіі, медыцыны і сельскай гаспадаркі, тэхнікі і будаўніцтва і іншых.

**У. ДУКТАЎ.**

# НДІ ПФП: вынікі працы і перспектывы

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

Усе пералічаныя мерапрыемствы хоць і заслугоўваюць сур'ёзнай увагі, але не толькі яны вызначаюць аблічча інстытута. Як ужо упаміналася вышэй, задача любой навукова-даследчай установы — праводзіць актуальныя распрацоўкі найбольш буйных і важных праблем у сціслыя тэрміны і на высокім узроўні. У гэтым напрамку за прайшоўшыя два гады ў нас дасягнуты значныя поспехі. У цяперашні час калектыў інстытута працуе над трыма тэмамі народнагаспадарчага плана БССР (на 1973 г. плануецца 8); 18 — па заданнях Дзяржкамітэта Савета Міністраў СССР па навуцы і тэхніцы і толькі 4 тэмы носяць пошукавы характар.

У выніку аказанай дапамогі з боку партыйных і савецкіх арганізацый нам удалося практычна поўнасцю забяспечыць усе службы інстытута штатным персаналам і значна павялічыць кантынгент навуковых і інжынерна-тэхнічных работнікаў. Цяпер у інстытуце створана 12 лабараторый, аб'яднаных па праблематыцы ў тры аддзелы. Нягледзячы на цяжкасці росту, звязаныя з пераездам у новы корпус і асваеннем вытворчых плошчаў, запланаваны на бягучы год аб'ём даследаванняў будзе выканан.

Станоўчым у рабоце лабараторый, на наш погляд, з'яўляецца і тое, што кожная з іх выконвае не больш 2—3 тэм. Такая канцэнтрацыя намаганняў вялікага калектыву супрацоўнікаў, звязаных агульнасцю мэт і ідэй, дазваляе брацца за рашэнне буйных праблем. Адметнай асаблівасцю з'яўляецца і той факт, што ў асобных выпадках аб'ядноўваюцца намаганні некалькіх лабараторый для рашэння той ці іншай задачы. І вынікі не прымушаюць сябе чакаць. Па выніках шэрагу даследаванняў мы выйшлі на перадавыя пазіцыі. Пацвярджэннем служаць прапановы з боку некаторых вядучых навуковых арганізацый і інстытутаў краіны (спецыяльная астранамічная абсерваторыя АН СССР, ФІАН СССР імя Лебедзева і інш.) выканаць дагаворныя работы па асноўных навуковых напрамках. Больш таго, яны звярнуліся ў Дзяржкамітэт Савета Міністраў СССР па навуцы і тэхніцы з просьбай уключыць шэраг новых тэм у план навуковых даследаванняў на 1973 год з мэтавым назначэннем дадатковага фінансавання. Мы спадзяемся, што гэтыя прапановы знойдуць у ГКНТ СМ СССР станоўчы водгук, што дазволіць пашырыць нашы магчымасці і прыцягнуць новую вялікую групу маладых спецыялістаў.

Пэўныя поспехі дасягнуты па гаспадарча-дагаворнай тэматыцы. Інстытут у гэтым годзе заключыў і прадаўжаў пачатыя раней даследаванні па 9 гаспадарча-дагаворных работах на агульную суму 630 тыс. руб. Тут трэба адзначыць ініцыятыву нашых электроншчыкаў (лабараторыя паўправадніковай электронікі — кіраўнік А. Ф. Чарняўскі, інфармацыйна - вымяральных сістэм — кіраўнік А. В. Пракураў). На аснове атрыманых навуковых вынікаў па бюджэтнай тэматыцы імі створан па заказах розных прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў краіны шэраг зусім новых прыбораў—вымяральнікаў малых інтэрвалаў часу, формы светавых імпульсаў і інш., якія знойдуць шырокае прымяненне ў практыцы навуковага эксперыменту. Важная гаспадарча-дагаворная работа праводзіцца лабараторыяй люмінесцэнцыі ў садружнасці з Магілёўскім заводам сінтэтычнага валакна. Такім чынам, заключэнне гаспадарчых дагавораў мы разглядаем як метад укаранення ў народную гаспадарку вынікаў навуковых даследаванняў. У выніку гэтага гаспадарча-дагаворная тэматыка арганічна звязана з дзяржбюджэтнай і ў большасці выпадкаў з'яўляецца яе прадаўжэннем.

Вялікія і сур'ёзныя задачы стаяць перад інстытутам у наступаючым 1973 годзе. Выконваючы пастанову ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне», калектыў супрацоўнікаў інстытута на вытворчым сходзе, які адбыўся 26 кастрычніка, прыняў павышаныя абавязацельствы, якія з'яўляюцца праграмай нашай дзейнасці. Прадугледжваецца, у прыватнасці, распрацаваць і зацвердзіць перспектыўны план навукова-даследчых работ (НДР) інстытута да 1990 года, прадставіць тры новыя тэмы для ўключэння іх у тэматычны план ГКНТ СМ СССР з выдзяленнем дадатковага фінансавання мэтавым назначэннем і пяць тэм у народнагаспадарчы план БССР, выканаць пяць гаспадарчых дагавораў на суму 0,4 млн. руб., унесці прапанову аб укараненні дзвюх закончаных навукова-даследчых работ. Будзе здзейснена шырокае прыцягненне студэнтаў старэйшых курсаў да выканання НДР па тэматыцы інстытута, да падрыхтоўкі курсавых і дыпломных работ, прадастаўленне лабараторных пляцовак і абсталявання для праходжання вытворчай практыкі і правядзення эксперыментаў, забеспячэнне высокакваліфікаванага кіраўніцтва студэнцкімі работамі навуковымі супрацоўнікамі НДІ ПФП, а таксама чытанне імі спецыяльных курсаў на фізічным факультэце БДУ. З мэтай павышэння навуковай кваліфікацыі супрацоўнікаў на 1973 год плануецца падрыхтаваць да абароны дзве доктарскія і 12 кандыдацкіх дысертацый, апублікаваць адну манаграфію і 60 артыкулаў, паслаць пяць заяў на атрыманне аўтарскіх пасведчанняў, распрацаваць шэраг новых установак і да іх методыкі даследаванняў, стварыць свае службы навукова-тэхнічнай інфармацыі і патэнтна-ліцэнзійнай работы. Для забеспячэння паспяховага выканання НДР будуць арганізаваны дзве новыя лабараторыі, вытворчыя майстэрні, пашыран штат навуковых і інжынерна-тэхнічных работнікаў, умацавана матэрыяльна-тэхнічная база. Спецыяльны раздзел абавязацельстваў прысвечан павышэнню ідэйна-палітычнага ўзроўню супрацоўнікаў, шэфскай рабоце сярод сельскага насельніцтва, воінаў Савецкай Арміі і школьнікаў.

Мы разумеем, што, акрамя нявырашаных пытанняў, у нас ёсць і многа недахопаў, якія перашкаджаюць паспяховаму ажыццяўленню патрабаванняў, вызначаных у пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб вышэйшай школе.

Не ўсе аддзелы і лабараторыі аднолькава актыўна ўдзельнічаюць у пашырэнні і ўмацаванні тэматыкі навуковых даследаванняў інстытута. Лабараторыі нелінейнай оптыкі, кантактных з'яў, тэарэтычнай фізікі не праяўляюць належнай ініцыятывы ў гэтым пытанні. У выніку яны вядуць або толькі пошукавыя даследаванні (лабараторыя тэарэтычнай фізікі), або з году ў год працягваюць працаваць па сваёй, дастаткова вузкай тэматыцы, не прадстаўленай ні ў наргасплане, ні ў каардынацыйных планах па важнейшых праблемах, ні, тым больш, у плане Дзяржкамітэта Савета Міністраў СССР па навуцы і тэхніцы (лабараторыя нелінейнай оптыкі).

Сур'ёзная і цяжкая задача стаіць перад калектывам інстытута — арганізаваць вытворчыя майстэрні. Станочны парк, які ёсць у інстытуце, ужо дазваляе распачаць работу. Аднак адсутнасць штатаў і кадраў, нізкія стаўкі, недастатковы ўзровень фінансавання тармозяць рашэнне гэтага пытання.

Вытворчыя майстэрні мы разглядаем як будучую базу для ўкаранення навукова-даследчых работ. Аднак сёння нельга забываць і аб выкананні дзярждагавораў. На жаль, некаторыя аддзелы і лабараторыі самаўхіліліся ад гэтай работы.

Нізкая яшчэ працоўная дысцыпліна. Раней, з прычыны адсутнасці транспартных сродкаў і арганізацыі харчавання, з такім становішчам даводзілася мірыцца. Цяпер, калі створаны або будуць у бліжэйшы час створаны адпаведныя ўмовы, неабходна рашуча пакончыць з такім становішчам. Адначасова трэба строга падтрымліваць правілы і ажыццяўляць мерапрыемствы па тэхніцы бяспекі і ахове працы. У ліквідаванні гэтых недахопаў ма...бачым залог нашых поспехаў.

Падводзячы вынікі і крытычна ацэньваючы нашу дзейнасць, можна не сумнявацца, што калектыў супрацоўнікаў НДІ прыкладных фізічных праблем, малады, поўны энергіі і творчага энтузіязму, ідучы насустрач 50-годдзю СССР, паспяхова справіцца з пастаўленымі перад ім нашай партыяй і ўрадам вялікімі і адказнымі задачамі.

**Д. УМРЭЙКА,**
**доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, намеснік дырэктара інстытута па навуковай рабоце.**

● *Даследаванні па люмінесцэнцыі праводзіць ст. тэхнік Т. І. ЛІПЕНЬ.*

● *Інжынер В. В. ПАЛЬСКОЎ і ст. тэхнік В. М. КУЗЬМІН за наладкай апаратуры.*

Фота *Д. Чаховіча.*





*АГЛЯД ДРУКУ*

# І ШТО ГЭТА ЗА НІТАЧКА?..

**Ці задумваліся вы калі-небудзь, што значыць у вашым жыцці насценная газета?! Хутчэй, не. Проста прывыклі час ад часу бачыць яе ў пэўным месцы. Чытаць, калі ёсць нешта цікавае, або раўнадушна праходзіць міма: маўляў, зноў сумота. Але вось з'явіліся аднойчы ў вашым «Алгарытме» ці «Хіміку» хлёсткі фельетон або добрыя вершы, і на кожным перапынку ля газеты — натоўп.**

Газета нябачнай нітачкай звязвае нас, студэнтаў розных курсаў, патокаў і груп, у тое адзінае цэлае, што называецца факультэтам, студэнцкай сям'ёй. Толькі шкада, што часам нітачка гэта бывае нетрывалай.

На хімфаку можна назіраць такі малюнак: ля бюлетэня акадэмсектара камітэта камсамола тоўпяцца студэнты, а ля газеты «Хімік» — пуста. А яны ж вісяць побач. Чаму так здарылася? Давайце разам пачытаем гэты нумар. Дарэчы, невядома, які па ліку, бо няма ў ім нават парадкавага нумара.

Газета, па ўсім відаць, святочная. Адкрываецца артыкулам пра Вялікую Кастрычніцкую рэвалюцыю. А аб тым, з якімі поспехамі прыйшоў да свята факультэт,— ні слова, нават віншавання не відаць.

Наступны — артыкул з камсамольскай канферэнцыі факультэта. У канцы прыпіска: «Рэдакцыя лічыць, што тут адлюстраваны найбольш важныя пытанні камсамольскага жыцця факультэта, ніколькі не зніжаючыя значэння іншых». Але ж нам здалося іншае: пытанні камсамольскага жыцця толькі пастаўлены ў выглядзе цытат з даклада і выступленняў у спрэчках. Няма аналізу, вывадаў ці меркаванняў. А без гэтага матэрыял атрымаўся сухі і зусім непатрэбны.

Можа здацца, што ў «Хіміку» і чытаць няма чаго. Гэта не так. Ёсць у рэдакцыі і свае ўдачы. Адной з іх можна лічыць «Афіцыйны аддзел». У ім — расказ аб канферэнцыі ДТСААФ. Тут дарэчы і кароткія інфармацыі і неблагія малюнкі. На жаль, гэты матэрыял аказаўся ў адзіноце. Склалася ўражанне, што рабілі нумар нецікаўныя, не ўлюбёныя ў працу людзі. Зрабілі, як кажуць, абы з рук. Вось і атрымалася, што іх жа сябры, чытаючы газету, уголас гаварылі: «Лухта». А іменна так і гаварылі пра матэрыял «Працяг непачатай размовы», аўтар якога хацеў цікава і з гумарам расказаць пра турысцкі паход, а збіўся на туманныя разважанні.

Некаторыя скажуць, маўляў, што гаварыць пра «Хімік», калі многія газеты такія. Згодна, многія. Але ж некалькімі паверхамі вышэй вісіць газета біялагічнага факультэта, дзе кожны матэрыял нясе чытачу новыя цікавыя факты, дзе форма сапраўды адпавядае зместу. «Віту» хочацца чытаць усю: ад пачатку да канца. Сур'ёзнасць саліднага выдання (нават дата першага выпуску ўказваецца) спалучаецца тут з непасрэднасцю і гумарам студэнцкай насценгазеты. І калі рэдкалегія «Хіміка» да гэтага часу не пабывала ў гасцях у вітаўцаў і не папрасіла парады і дапамогі, хай вінаваціць толькі сябе. Мы ж параім нанесці такі візіт суседзям як мага хутчэй.

Пры знаёмстве з газетай «Гісторык» у першую чаргу кідаецца ў вочы маштабнасць газеты. Цэлую калонку займае застаўка, якой адкрываецца нумар, фірма таксама размясцілася на цэлай калонцы.

Але не хвалюйцеся, на матэрыялы месца яшчэ засталося, бо даўжыня ўсяго нумара больш трох метраў.

Ну, калі словам прасторна, то думкам павінна быць яшчэ прастарней. Аказалася — не. Маштабы вялікія, а геаграфія — малая. «Справы вучэбныя» расказваюць толькі пра вячэрнікаў і студэнтаў І курса. Няма аператыўнасці. Яшчэ 7 кастрычніка быў госцем факультэта лётчык-касманаўт Г. Цітоў, а газета расказвае аб гэтым толькі праз месяц. Тое ж самае можна сказаць і аб рэпартажы з асенняга кросу.

Рубрыка «Да 50-годдзя СССР» ёсць яшчэ не ва ўсіх насценгазетах. У «Гісторыку» яна ёсць, і гэта радуе. Толькі замест таго, каб расказаць нешта новае, цікавае, газета паўтарае ўсім вядомыя факты пра Азербайджан, Грузію, Казахстан.

«Навука перамагаць у навуцы» — загаловак яркі. Так і цягне паглядзець, што ж там напісана. Толькі не хапае сіл прачытаць і двух абзацаў. Мяркуйце самі: «...дэкан філасофскага факультэта МДУ, канкрэтызуючы гэтую думку, акцэнтаваў увагу прысутных на актывізацыі...» А між тым тут ідзе размова пра студэнцкую навуковую канферэнцыю ў Маскве.

Звернемся зноў да маштабаў газеты. Здаецца, каб пазбавіць яе матэрыялаў накшталт «Савецкія артысты ў Парыжы», газета не прайграла б, а наадварот стала б цікавейшай. Дарэчы, «Віта» займае плошчу ў два разы меншую, а матэрыялаў змяшчае ў два разы больш.

Нельга сказаць, каб усё так дрэнна было ў «Гісторыку». Толькі і тут не відаць клапатлівай рукі рэдкалегіі. Таму і слабее нітачка «газета — чытач», так і глядзі — парвецца.

**Л. ПЕРАСЫПКІНА.**

*ТВАЕ ВЫКЛАДЧЫКІ, СТУДЭНТ*

# ЗАЎСЁДЫ З ЮНАЦТВАМ

Адгрымелі апошнія залпы вайны. Вярталіся ў родныя мясціны франтавікі, браліся за аднаўленне разбуранай гаспадаркі. Дваццацігадовым хлопцам вярнуўся на роднае Палессе пасля баёў на Карэльскім перашыйку, ва Усходняй Прусіі, Сілезіі і Іван Навуменка. Да вайны марыў ён паступіць у КІЖ (Камуністычны інстытут журналістыкі) вучыцца, а прыйшлося, перш чым ажыццявіць сваю мару, быць падпольшчыкам, партызанам, франтавіком.

Толькі ў снежні 1945 года Іван Навуменка паступіў на завочнае аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Скончыўшы два курсы, ён пераводзіцца на аддзяленне роднай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта. Адначасова працуе карэспандэнтам мазырскай абласной газеты «Бальшавік Палесся». Пакрысе піша вершы, нарысы аб калгасным жыцці, упарта штурмуе вяршыні універсітэцкай навукі.

Нялёгкімі былі першыя пасляваенныя гады. Мінск ляжаў у руінах. У студэнцкіх аўдыторыях было часам халадней, чым на двары. Ды і не хапала гэтых аўдыторый. Займаліся студэнты ў памяшканнях ўцалелых мінскіх школ.

Але вучоба ішла. З надзвычайным энтузіязмам пераадольвалі студэнты — былыя франтавікі, партызаны перашкоды і цяжкасці. З натхненнем памагалі ім у гэтым выкладчыкі універсітэта. Гэта былі энтузіясты, надзвычай цудоўныя людзі. Як успамінае Іван Навуменка ў апавяданні «Салдаты вярнуліся», «яны ледзь не ўсе былі дзівакамі, заклаўшы рукі за спіну, расхаджвалі па аўдыторыі і з выглядам першаадкрывальнікаў кідалі ў залу бясспрэчныя ісціны сваіх навук». Запомніўся нізенькі, шчупленькі Давід Яўсеевіч Фактаровіч, што чытаў літаратуру старажытнай Грэцыі. Малады яшчэ, ён адпусціў вусы, на вузкіх плячах насіў шырачэзны, замежнага паходжання, пінжак і жоўтыя крагі з гетрамі і меў на дзіва зычны, артыстычна пастаўлены голас. «По древней Элладе бродили аэды...» Ён гаварыў так, што сумнявацца нельга было. Трэба было настроіцца на адзіную хвалю і верыць, што сказанае ім складае аснову жыцця. У жыцці Давід Яўсеевіч вызначаўся прастатою. Любіў студэнтаў. Ён «жыў у інтэрнаце, у закуранай бляшанцы з-пад кансерваў варыў аўсянку на вячэру, старанна адмерваючы лыжкай крупы. Ва ўсім гэтым было штосьці да болю ў сэрцы харошае».

Дзякуючы такім выкладчыкам, як Д. Я. Фактаровіч, М. Я. Рэзнікаў, В. Л. Саўсун, студэнты-завочнікі ў час сесій рабілі цудоўныя і непаўторныя падарожжы ў гісторыю, літаратуру, глыбей адчувалі каларытнасць і шчырасць мовы народа.

Шэсць год завочнага навучання ва універсітэце далі Івану Навуменку многае. «Было цікава вучыцца, жыць, дыхаць у сценах філфака, — успамінае зараз Іван Навуменка.—Усюды адчуваўся подых літаратурнага жыцця, энтузіязм, з якім авалодвалі ведамі сябры па аспірантуры — Пахомаў (цяпер дырэктар Мінскай вышэйшай партыйнай школы), Шакун, Адамовіч, Кіслік, Яфімава».

У гэты час Іван Навуменка як ніколі зрадніўся з літаратурай свайго народа, зажыў думкамі і пачуццямі герояў лепшых твораў Коласа, Купалы, Чорнага, Бядулі, Броўкі, Куляшова, Танка і іншых.

У 1954 годзе, пасля трох год навучання ў аспірантуры, Іван Якаўлевіч Навуменка абараніў кандыдацкую дысертацыю на блізкую сэрцу тэму: «Творчасць Якуба Коласа». Ён з душэўнай зацікаўленасцю паглыбляецца ў дух творчасці песняра Беларусі, пазнае таямніцы мастацкага майстэрства.

У час вучобы ў аспірантуры Іван Навуменка нейкі час працаваў у рэдакцыі газеты «Звязда», часопісе «Маладосць», дзе ў гэты час супрацоўнічалі прызнаныя паэты і празаікі — Мікола Аўрамчык, Янка Брыль, Георгі Шчарбатаў, Аляксей Кулакоўскі. «Я сутыкнуўся з гэтым літаратурным асяроддзем і пад уплывам гэтых цудоўных майстроў слова стаў пакрысе пісаць апавяданні», — успамінае Іван Якаўлевіч. Яшчэ ў гады навучання ва універсітэце Навуменка спрабаваў пісаць апавяданні. На жаль, далёка не заўсёды прыходзіў поспех. Вершы атрымліваліся больш удалыя.

У 1947 годзе ён надрукаваў у газеце «Літаратура і мастацтва» свой першы верш. Потым вершы Навуменкі з'яўляюцца на старонках маладзёжнай газеты «Чырвоная змена». Але і пасля гэтых публікацый Іван Навуменка не думаў, што лёс назаўсёды звяжа яго з літаратурай, тым больш з прозай.

Празаікам лічыць сябе Навуменка з 1955 года, калі ў чэрвеньскім нумары часопіса «Маладосць» змясціў два свае першыя апавяданні «Эх, махорачка» і «Сідар Гараська». З таго часу талент празаіка развіваецца хутка і ўпэўнена.

У 1957 годзе выходзіць першая кніжка апавяданняў Івана Навуменкі «Семнаццатай вясной». Успаміны ваеннага юнацтва, подзвігі сучаснікаў пісьменніка — гэта тэма хвалюе і прымушае Навуменку звяртацца да яе на працягу апошніх дзесяці год творчасці. Перажытае знаходзіць сваё яскравае ўвасабленне ў цудоўных, непаўторных апавяданнях.

Паступова, праз апавяданні аб юнацтве сваіх равеснікаў, апаленых вайною, ішоў Іван Навуменка да сваіх першых аповесцей і раманаў.

Калі прасачыць за выхадам у свет кніжак І. Навуменкі, то можна заўважыць, што ў празаіка няма творчага застою: праз год-два ў друку з'яўляюцца новыя і новыя кнігі. Тут і апавяданні, і аповесці, і раманы. Праўда, тэматыка іх амаль што адна і тая ж. У яго творах жыве ва ўсім сваім хараstве і непаўторнасці перадваенная юнацкая пара, цяжкі і герaічны час Вялікай Айчыннай вайны. Фактычна ў яго творах адбіліся складанасці жыцця самога пісьменніка, яго перажыванні і пачуцці. Мо таму і хвалююць творы Навуменкі, вабяць суровай праўдай жыцця.

Дарэчы напомніць, што зусім нядаўна І. Навуменку за зборнік апавяданняў «Таполі юнацтва» была прысуджана прэмія імя Ленінскага камсамола Беларусі.

Іван Навуменка шмат часу ўдзяляе і навуковай працы. Ён, прафесар, доктар філалагічных навук, на працягу семнаццаці гадоў выкладае родную літаратуру ва універсітэце.

Іван Навуменка — аўтар шэрагу кніг пра класікаў роднай літаратуры («З глыбінь жыцця», «Пісьменнікі-дэмакраты», «Янка Купала», «Якуб Колас»), многіх артыкулаў і рэцэнзій. Свой дар ён нясе роднаму народу, прагным да ведаў юнакам і дзяўчатам, якія кожны дзень запаўняюць светлыя аўдыторыі універсітэта.

**У. ЛАЙКОЎ,**
**член гуртка гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры філфака.**

## КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

### ПАВЕДАМЛЯЕ ПРЭС-ЦЭНТР

У панядзелак раніцай ад галоўнага корпуса універсітэта адышоў аўтобус, упрыгожаны лозунгамі і транспарантамі. Пачаўся агітпрабег лепшых прадстаўнікоў універсітэцкай камсамоліі па Беларусі і Прыбалтыцы, прысвечаны 50-годдзю ўтварэння СССР. Яго ўдзельнікі—лектары, пераможцы конкурсаў студэнцкіх навуковых работ, інструментальны ансамбль геафака «Пілігрымы». Агітпрабег па маршруту Мінск—Лепель—Наваполацк — Даўгаўпілс—Вільнюс—Баранавічы—Мінск працягнецца сем дзён.

Больш за 100 камсамольскіх актывістаў універсітэта прынялі ўдзел у вучобе актыву, якая была арганізавана гаркомам камсамола на базе тэхналагічнага інстытута.

## ЭКСКУРСІЯ ДРУЖБЫ

**У нядзелю замежныя студэнты ездзілі на экскурсію ў гаспадаркі Клецкага раёна Мінскай вобласці. Яны пабывалі ў калгасе «Савецкая Беларусь» і на ордэна Леніна племзаводзе «Чырвоная Зорка». Гэта паездка па рэкамендацыі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР была арганізавана дэканатам па навучанню замежных студэнтаў, якія займаюцца на падрыхтоўчым і асноўных факультэтах нашага універсітэта.**

**У экскурсіі прынялі ўдзел звыш 50 чалавек з 11 краін свету.**

**Заўважыўшы ў чытальнай зале балгарына Антона Герчава, я вельмі ўзрадавалася. Стаж нашага знаёмства — толькі адзін дзень. Учора мы ездзілі разам на экскурсію.**

**Перад вачыма кожнага з удзельнікаў паездкі яшчэ ва ўсіх падрабязнасцях паўстаюць карціны паездкі, а праз месяц ці болей яны будуць успамінаць іх па фотаздымках. І балгарскі студэнт Мікалай Бажкоў, мабыць, будзе жартаваць, трымаючы фатаграфію ў руках:**

**— Гэта ж трэба, валасы такія сівыя, амаль белыя. І каб жа ад навукі, а то ад снегу.**

**Без метэазводкі тут не абысціся. Спадаў ранішні мароз, буйнымі пушынкамі ішоў снег, калі ў дарозе ў час прыпынку аўтобусаў студэнты пачалі гуляць у снежкі.**

**У Клецку ўдзельнікаў экскурсіі сустракалі першы сакратар раённага камітэта камсамола У. У. Камлач, дырэктар ордэна Леніна племзавода «Чырвоная Зорка» А. В. Алексаў, заатэхнік В. І. Савельеў і іншыя. Вельмі прыемным для кожнага студэнта было тое, што і гутарка з кіраўнікамі гаспадаркі ў сярэдняй школе праходзіла вельмі шчыра і надзвычай проста. На самыя разнастайныя па свайму характару пытанні замежных студэнтаў адказваў дырэктар племзавода А. В. Алексаў на працягу ўсяго дня.**

**На розных мовах свету гучалі ў час абеду слова падзякі, адрасаваныя паварам і афіцыянтам сталовай. Захапляючым быў малюнак, калі з-за стала падымаліся балгары і хорам гаварылі «благодаря», потым немцы — «данке шён», арабы — «шукран», румыны — «мулцумеск».**

**Вечарам у калгасным клубе сабралася шмат людзей. Са словамі ўдзячнасці за запрашэнне і аказаную гасціннасць звярнуліся да жыхароў суданец Самір Шахін, кубінец Фабрыцыо, балгарын Антон Герчаў і іншыя. Рускія песні ў выкананні в'етнамскіх студэнтаў заўсёды ўспрымаюцца цёпла. Працяглымі апладысментамі дзякавалі жыхары в'етнамцу Ву Чунг Хіеу, калі той праспяваў «Рускае поле»...**

**Позна вечарам багатыя ўражаннямі студэнты вярталіся ў Мінск.**

**В. РАДКЕВІЧ,**
**член савета дружбы універсітэта.**



# УТВАРЭННЕ САЮЗА ССР—ПЕРАМОГА ЛЕНІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ

У. І. Ленін прадбачыў, што пасля перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі большасць нацый і народнасцей Расіі добраахвотна выберуць розныя формы свайго існавання ўнутры шматнацыянальнай дзяржавы. Гэтымі формамі маглі быць і аўтаномія ў межах адзінай дзяржавы і федэрацыя.

Падкрэсліваючы перавагу дэмакратычна - цэнтралізаванай унутранай дзяржавы пры іншых роўных умовах, У. І. Ленін падыходзіў да пытання аб дзяржаўных формах з дыялектыка-матэрыялістычных пазіцый. Пасля звяржэння самадзяржаўя ён убачыў, што ў склаўшыхся ўмовах шлях інтэрнацыянальнага аб'яднання Расіі ў адной шматнацыянальнай дзяржаве запатрабуе аўтаноміі і федэрацыі. Пазней правадыр рэвалюцыі падкрэсліваў, што савецкая федэрацыя не толькі не супярэчыць дэмакратычнаму цэнтралізму, а наадварот, служыць «найбольш правільным крокам да самага трывалага аб'яднання розных нацыянальнасцей Расіі ў адзіную дэмакратычную цэнтралізаваную Савецкую дзяржаву».

Як і прадказваў У. І. Ленін, самастойныя народы Расіі з моманту ўстанаўлення Савецкай улады сталі на шлях развіцця дэмакратычных адносін. У гады інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны склаўся ваенна-палітычны і гаспадарчы саюз савецкіх рэспублік. Ён быў аформлен дэкрэтам УЦВК ад 1 чэрвеня 1919 года. Пасля вайны рэспублікі пашырылі ўзаемныя гаспадарчыя сувязі, яны стварылі рад аб'яднаных наркаматаў, ваенна-палітычны і гаспадарчы саюзы былі дапоўнены дыпламатычным. У 1922 годзе ўтварылася ЗСФСР, натхняльнікам і актыўным арганізатарам якой выступіў У. І. Ленін.

У сярэдзіне 1922 года федэратыўныя адносіны паміж рэспублікамі аказаліся дастаткова глыбокімі. Аб'ектыўныя заканамернасці развіцця грамадства, прырода савецкага грамадскага і дзяржаўнага ладу, канкрэтна - гістарычныя ўнутраныя і знешнія ўмовы, узнікшыя ў краіне пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі, абумовілі гэты гістарычны працэс. Рэспублікі стварылі цесны саюз, які не быў, аднак, адпаведным чынам аформлен. Само ж жыццё патрабавала дакладнага афармлення міжрэспубліканскіх адносін.

Новая форма дзяржаўнага адзінства Савецкай краіны была знойдзена не адразу. Камісія, створаная Аргбюро ЦК РКП(б) 11 жніўня 1922 года для падрыхтоўкі да чарговага пленума ЦК пытання аб узаемаадносінах нацыянальных рэспублік, у аснову свайго рашэння паклала ідэю І. В. Сталіна аб «аўтанамізацыі». Яна азначала змяншэнне праў саюзных з РСФСР рэспублік, падпарадкаванне іх РСФСР. Гэта не адпавядала ні ленінскім прынцыпам узаемаадносін паміж народамі, ні склаўшымся паміж незалежнымі нацыянальнымі рэспублікамі адносінам роўнасці і добраахвотнасці. І тыя і другія прадугледжвалі іншую форму дзяржаўнага адзінства.

У. І. Ленін, азнаёміўшыся з прапановамі камісіі, рашуча асудзіў ідэю «аўтанамізацыі» і ў пісьме да членаў Палітбюро ЦК ад 26 верасня выклаў свой план утварэння саюзнай дзяржавы. «Мы прызнаём сябе раўнапраўнымі з Украінскай ССР і інш., — указваў ён, — і разам і нароўні з імі ўваходзім у новы саюз, новую федэрацыю... Важна, каб мы не давалі пажывы «незалежанцам», не знішчалі іх **незалежнасці**, а стварылі яшчэ **новы паверх**, федэрацыю **раўнапраўных** рэспублік». У гэтым тэзісе заключаецца сутнасць ленінскай ідэі ўтварэння СССР — якасна новай федэрацыі, саюзнай федэрацыі. У. І. Ленін прапанаваў аб'яднаць рэспублікі ў саюзную дзяржаву, усе члены якой, застаючыся суверэннымі, добраахвотна перадалі б роўную частку праў у веданне федэрацыі — Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Ленінская ідэя ўтварэння СССР атрымала самае шырокае прызнанне ў краіне. Пленум ЦК РКП(б), які адбыўся 6 кастрычніка 1922 года, зацвердзіў ленінскі план аб'яднання савецкіх рэспублік. Рашэнні пленума былі падтрыманы кампартыямі рэспублік. Мнагалюдныя сходы і мітынгі працоўных, валасныя, уезныя, губернскія з'езды Саветаў, І Закаўказскі з'езд Саветаў, VII з'езд Саветаў УССР, IV з'езд Саветаў БССР, X Усерасійскі з'езд Саветаў адзінадушна адобрылі прапанову аб ўтварэнні СССР. Іх рашэнні былі праяўленнем глыбокага разумення рабочым класам, працоўным сялянствам, перадавой інтэлігенцыяй сваіх класавых і нацыянальных інтарэсаў, іх імкнення да ўмацавання брацкага саюза, заснаванага на прынцыпах добраахвотнасці, раўнапраўя і свабоды. І Усесаюзны з'езд Саветаў, прыняўшы гістарычныя заканадаўчыя акты — Дэкларацыю і Дагавор аб утварэнні СССР, абвясціў 30 снежня 1922 года аб стварэнні новай дзяржавы.

Вялікае значэнне для будаўніцтва саюзнай дзяржавы меў ленінскі артыкул «Да пытання аб нацыянальнасцях, або аб «аўтаманамізацыі». У ім У. І. Ленін падкрэсліў неабходнасць самай рашучай барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам, паслядоўнай і асцярожнай барацьбы з мясцовым нацыяналізмам. Ён патрабаваў няўхільна падтрымліваць прынцыпы пралетарскага інтэрнацыяналізму, які прадугледжвае ўсямерную свабоду і ўсебаковае развіццё нацый і народнасцей, прадухіліць адміністрыраванне ў здзяйсненні нацыянальнай палітыкі, праяўляць максімальную чуласць і ўвагу да працоўных прыгнечаных у мінулым народаў. У. І. Ленін адзначыў важнасць рашэння нацыянальнага пытання ў СССР для сотняў мільёнаў народаў Азіі.

Ленінскія ўказанні ляглі ў аснову рэзалюцыі XII з'езда РКП(б) па нацыянальнаму пытанню. На з'ездзе атрымала поўную падтрымку прапанова аб стварэнні ў саставе ЦВК Саюза ССР на аснове роўнасці другой палаты — Савета Нацыянальнасцей. Пазней па ініцыятыве М. І. Калініна вышэйшым органам федэрацыі быў аб'яўлен Усесаюзны з'езд Саветаў замест агульнасаюзнага ЦВК, як прадугледжвалася раней. Было прынята патрабаванне У. І. Леніна аб забеспячэнні поўнага раўнапраўя ўсіх саюзных рэспублік у кіраўніцтве агульнасаюзным ЦВК.

З улікам заўваг, выказаных У. І. Леніным, камісіяй ЦК партыі, ЦВК саюзных рэспублік канчатковы тэкст Дэкларацыі і Дагавору аб утварэнні СССР ужо ў выглядзе першай Канстытуцыі СССР быў прынят на другой сесіі ЦВК Саюза СССР і ўведзен у дзеянне 6 ліпеня 1923 года, а затым зацверджан на II Усесаюзным з'ездзе Саветаў 31 студзеня 1924 года.

Утварэннем СССР завяршыўся важнейшы этап у фарміраванні міжнацыянальнай агульнасці народаў краіны. У Саюзе ССР увасобіліся эканамічныя, палітычныя і культурныя інтарэсы савецкіх нацый, народнасцей і этнаграфічных груп. З утварэннем СССР развіццё адносін дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі Краіны Саветаў пайшло наперад гіганцкімі крокамі. Сусветная прагрэсіўная грамадскасць вітала ўтварэнне СССР як перамогу новых ідэй садружнасці народаў.

Стварэнне СССР азначала ажыццяўленне ідэалагічных прынцыпаў палітыкі партыі, яе інтэрнацыянальнай сутнасці.

**В. СІДАРЦОЎ,**
**дацэнт кафедры гісторыі СССР.**



# НОВЫЯ КНІГІ

## ПА БІЯЛОГІІ, ЯКІЯ ПАСТУПІЛІ Ў БІБЛІЯТЭКУ БДУ

1. Бураков В. В. и др. Новые данные о месторождениях кор выветривания и россыпях тантала за рубежом. М., «Наука», 1972.
2. Геология докембрия. Л., «Наука», Ленингр. отд-ние, 1972.
3. Глазунова А. Е. Палеонтологическое обоснование стратиграфического расчленения меловых отложений Поволжья. Верхний мел. М., «Недра», 1972.
4. Костенко Н. П. Развитие складчатых и разрывных деформаций в орогенном рельефе. М., «Недра», 1972.
5. Певзнер М. А. Палеомагнетизм и стратиграфия плиоценчетвертичных отложений Камчатки. М., «Наука», 1972.
6. Подземный сток и методы его исследования. (Сборник статей). М., «Наука», 1972.
7. Проблемы биостратиграфии и палеонтологии нижнего кембрия Сибири. (Сборник статей). М., «Наука», 1972.
8. Руттен М. Г. Геология Западной Европы. (Перевод с английского). М., «Мир», 1972.
9. Строение западной части Черноморской впадины. Верхняя мантия. М., «Наука», 1972.

# СПАРТЫЎНУЮ ЗАГАРТОЎКУ—КОЖНАМУ

## Спорт

Каля 600 лепшых спартсменаў сабраліся 23 лістапада на агульнауніверсітэцкую справаздачна-выбарную канферэнцыю ДСТ «Буравеснік», каб адкрыта пагаварыць аб надзённых праблемах, поспехах, планах на будучае.

Аб тым, што было зроблена фізкультурным актывам універсітэта ў юбілейным годзе, расказаў старшыня праўлення спортклуба БДУ С. Камінскі.

Цяпер ва універсітэце больш 8 тысяч студэнтаў і супрацоўнікаў займаюцца спортам. Вучэбна-трэніровачныя заняткі праводзяць вопытныя выкладчыкі кафедры фізвыхавання і спорту. У распараджэнні студэнтаў —добра абсталяваныя залы, выдатны спартыўны інвентар.

Закончылася XX юбілейная спартакіяда па 26 відах спорту. Першы этап спартакіяды — масавыя спаборніцтвы ў групах, на курсах і факультэтах. Імі былі ахоплены амаль усе студэнты. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца лёгкаатлетычныя кросы. У 1971-72 годзе ў іх удзельнічала больш 10 тысяч чалавек. Другі год праводзяцца спаборніцтвы па валейболу, баскетболу і футболу. Выяўляліся лепшыя, ствараліся зборныя каманды факультэтаў, якія разыгралі паміж сабой галоўныя прызы спартакіяды. Вынікі яе такія: І месца заняў факультэт прыкладной матэматыкі, ІІ — фізічны і III — гістарычны факультэты.

Але для нас сёння важна і другое. Усё пазнаецца у параўнанні. І тут можна звярнуцца да іншых вынікаў—вынікаў XV рэспубліканскай міжвузаўскай спартакіяды. Калі былі падлічаны апошнія ачкі, то аказалася, што калектыў БДУ заняў чацвёртую ступеньку ў турнірнай табліцы і палепшыў свае вынікі ў параўнанні з XIV спартакіядай у 11 відах спорту. Можна павіншаваць жаночую баскетбольную каманду, выйграўшую гэтыя спаборніцтвы. Нашы дзяўчаты з'яўляюцца таксама ўладальнікамі кубка горада і сярэбранымі прызёрамі першынства БССР. У гэтым несумненная заслуга і трэнера каманды Г. Н. Грудо.

Вялікі ўклад у капілку ачкоў унеслі лёгкаатлеты і цяжкаатлеты, якія занялі другія месцы, уступіўшы толькі спартсменам ІФК.

І ўсё ж нельга сказаць, што нашы спартсмены зрабілі ўсё магчымае. Дрэнна выступілі гандбалісты, фехтавальшчыкі, баксёры і стралкі.

Больш паўгода прайшло з той пары, як уступіла ў дзеянне палажэнне аб новым комплексе ГПА.

З 8.253 студэнтаў і 855 супрацоўнікаў, прымаўшых удзел у здачы норм, толькі 34 чалавекі поўнасцю выканалі патрабаванні комплексу і сталі значкістамі. З 1.500 чалавек, здаваўшых нормы па плаванню, толькі 371 здаў іх. Прыкметна знізілася работа па ўкараненню новага комплексу пасля летніх канікулаў. Недастаткова прыцягваюцца да здачы норм студэнты старшых курсаў.

У чым справа? Чаму пры вялікай колькасці студэнтаў і супрацоўнікаў, добрай базе, дастаткова вялікай колькасці трэнераў і выкладчыкаў у нас такія нізкія паказчыкі па здачы норм ГПА?

Адказ на гэтае пытанне далі выступленні прарэктара па вучэбнай рабоце прафесара С. А. Умрэйкі, старшыні прафкома БДУ М. М. Дразда, намесніка старшыні Белсавета ДСТ «Буравеснік» М. Л. Парэнчыка, старшынь спортбюро факультэтаў. У рабоце спортклуба і фізкультурнага актыву універсітэта яшчэ многа істотных недахопаў. Падрыхтоўка спартсменаў ускладаецца толькі на выкладчыкаў кафедры і фізвыхавання. Грамадскія арганізацыі большасці факультэтаў удзяляюць спорту недастаткова ўвагі. Спортклубу неабходна абапірацца ў сваёй рабоце на камітэты камсамола факультэтаў, часцей цікавіцца справамі зборных факультэцкіх каманд. За мінулы год не выкананы планы па здачы членскіх узносаў на фізічным і матэматычным факультэтах. Штогод ва універсітэт прымаецца вялікая колькасць першаразраднікаў і кандыдатаў у майстры спорту. Толькі некаторыя з іх, стаўшы студэнтамі, павышаюць сваё спартыўнае майстэрства. За справаздачны перыяд ва універсітэце падрыхтавана ўсяго 6 майстроў спорту СССР.

У БДУ ўжо не першы год існуе клуб турыстаў і альпіністаў. Аб вялікай і цікавай рабоце клуба расказаў, выступіўшы на канферэнцыі, А. Залан, член праўлення клуба. У 1972 годзе турыстамі універсітэта зроблены паходы па Беларусі, Уралу, Кольскаму паўвостраву, Каўказу. У час гэтых паходаў праводзіліся таварыскія сустрэчы па футболу, валейболу і баскетболу. Але ўся гэтая работа трымаецца на адным толькі энтузіязме членаў клуба. Спортклуб і прафком універсітэта амаль не выдзяляюць сродкаў на правядзенне паходаў і развіццё альпінізму.

Гэтыя недахопы неабходна ўлічыць новаму саставу праўлення спортклуба, выбранаму на канферэнцыі. Наш універсітэт, перадавая ВНУ рэспублікі, павінен стаць перадавым і ў развіцці фізкультуры і спорту.

**А. ХАНЦЭВІЧ,**
**А. ЦІТАВЕЦ.**

## ПРЫСВЕЧАНЫ ЮБІЛЕЮ

**Нядаўна адбыўся спартыўны вечар, прысвечаны 50-годдзю СССР. Яго арганізатарамі былі кафедра фізвыхавання і спартыўны клуб БДУ.**

**Вечар пачаўся падвядзеннем вынікаў XX спартакіяды БДУ. Быў зачытан загад рэктара універсітэта аб узнагароджанні граматамі і каштоўнымі падарункамі ўдзельнікаў спартакіяды.**

**У заключэнне адбыўся канцэрт мастацкай самадзейнасці і паказальныя выступленні спартсменаў. Поспехам карысталіся акрабатычныя жарты выкладчыка спорткафедры М. І. Бязручанкі, выступленні гімнастак, песні.**

**Т. ЗАСІМ.**

# Знаёмцеся: «ПІЛІГРЫМЫ»

Калі, праходзячы міма геафака, ты пачуеш гукі музыкі, ведай: рэпеціруюць «Пілігрымы».

Рэпетыцыя пачынаецца, як звычайна. Валодзя пад іоніку Ірыны настройвае гітару, Ваня правярае работу мікрафонаў, яму дапамагае Оля. Сёння прысутнічаюць усе. Толькі вельмі ўважлівая прычына можа паслужыць апраўданнем пропуску рэпетыцыі.

Закончана апошняя падрыхтоўка, апаратура працуе нармальна — можна пачынаць. Ні адна мінута рэпетыцыі не павінна прапасці дарма. Намячаюцца «рэчы», якія павінны «разбірацца» сёння, і пачынаецца праца. Так, рэпетыцыя — сапраўды праца. Любімая для іх, але ў той жа час клапатлівая, патрабуючая сіл, энергіі, часу, умення і яшчэ шмат іншага, аб чым, бадай, ведаюць толькі яны— «Пілігрымы»...

Як нарадзілася гэтая назва? Спачатку хацелася прыдумаць штосьці геаграфічнае, «прафесіянальнае», але нечакана прыйшоўшае рашэнне аказалася самым дакладным, самым верным, самым-самым... «Пілігрымы»... Гэта назва падыходзіць да ўсіх разам і да кожнага паасобку, яна ўжо не можа існаваць асобна ад іх. Яны «пілігрымы», якія — вечна ў пошуку, нястомныя падарожнікі.

І так, ідзе рэпетыцыя. У гэты час пануе жалезная дысцыпліна і разам з тым— поўная дэмакратыя. Можа быць, іменна гэта і з'яўляецца прычынай здзіўляючай зладжанасці, «сыгранасці» ансамбля, сапраўднай дружбы, павагі, чуласці яго ўдзельнікаў адзін да аднаго.

Відавочна, нам даўно пара пазнаёміцца з рабятамі. «Пілігрымы» — гэта пяцікурснікі Оля Бакшэева, Люся Марозава, Іра Троцкая, Ваня Юзафовіч, Косця Паравознікаў, Сярожа Шкарупа і студэнт трэцяга курса Валодзя Бабенка. Ёсць яшчэ ў іх Алік Рузанаў, Лёня Васерштром, Толя Бабкоў... Гэта «Пілігрымы», якія прыйдуць на змену цяперашнім, але ўжо зараз сталі часціцай калектыву.

Як нарадзіўся ансамбль? Бадай, гэтак жа, як многія самадзейныя ансамблі. На першым курсе ўтварылася трыо «Віоля» — Вера, Ірына, Оля. На універсітэцкім аглядзе дзяўчаты выступілі з песняй «Подрастают наши младшие сестренки». Акампаніравалі сабе на фартэп'яна. Выступленне спадабалася, дзяўчат запрасілі ў аркестр народных інструментаў. Пасля гэтага яны доўгі час падтрымлівалі сувязь з яго кіраўніком.

У час летняй практыкі пасля першага курса спрабавалі спяваць разам з рабятамі пад акампанемент гітар. Тады ж было наладжана выступленне КВЗ, у якім пераможцамі выйшлі хлопцы. На другім курсе правялі матч-рэванш. Прыбраўшыся ў хусцінкі, трое рабят так цікава парадзіравалі «Віолю», што гэты нумар доўга ўспаміналі на курсе. Ён быў уключан у праграму канцэрта на вечары сустрэчы з выпускнікамі.

На другім курсе практыка праходзіла на Нарачы. Жылі вельмі дружна, вечарамі збіраліся разам, хлопцы ігралі на гітарах, дзяўчаты спявалі. Першае іх сумеснае выступленне адбылося ля кастра, прысвечанага Дню вызвалення Мінска. Тады і прыйшла рабятам думка арганізаваць ансамбль. Яе падтрымала Надзежда Паўлаўна Хрыпко, кіраўнік агітбрыгады. Яна ж у многім дапамагала рабятам.

Цяпер без ансамбля трэцякурснікаў не абыходзілася ні адно выступленне агітбрыгады. Частку інструментаў купілі на грошы, выдзеленыя факультэтам. Астатнія — на зробленыя ў час суботнікаў на трактарным заводзе. Узмацняльнік, стойкі для мікрафонаў, ударную ўстаноўку зрабілі самі. Але ансамблю не хапала галоўнага: кіраўніка. На дапамогу прыйшоў Валерый Шапар, тады — студэнт 4 курса політэхнічнага інстытута. Ён быў удзельнікам і кіраўніком ансамбля і літаральна паставіў яго на ногі. Валерый іграў амаль на ўсіх інструментах, мог навучыць і дапамагчы любому, яго аўтарытэт быў бясспрэчным. Вельмі цяжка было рабятам, калі, на пятым курсе, Шапар ужо не змог удзяляць ім так многа ўвагі. Займаліся шмат у час рэпетыцый і пасля іх, часам бралі гітары дамоў. Вось тут і дапамагла іменна ўпартасць рабят, жаданне ў што б там ні стала не даць ансамблю распасціся.

«Пілігрымы» — аснова факультэцкай агітбрыгады. У іх рэпертуары песні савецкіх кампазітараў, рускія і беларускія народныя песні, многія ў іх асабістай апрацоўцы. Вялікай папулярнасцю ў гледачоў карыстаюцца песні «Ці свет, ці світае», «Любачка», «Бацька добры», «У ноч на Івана Купалу», «Ой, мароз, мароз», «Балада аб фарбах» на словы Р. Раждзественскага, песні з рэпертуару ансамбля «Спяваючыя гітары», «Саласпілс», «Добрая прыкмета» і многія іншыя. Пачынаюцца іх канцэрты звычайна інструментальнай п'есай «Пілігрымы», якую рабяты напісалі самі.

Цяпер «Пілігрымы» ўдзельнічаюць у агульнауніверсітэцкім агітпрабегу, прысвечаным 50-годдзю ўтварэння СССР. Са сваім канцэртам яны выступяць перад гледачамі Літвы, Латвіі, Беларусі. Прагарама канцэрта вельмі разнастайная і цікавая. Думаецца, што не раз яшчэ пачуюць самадзейныя артысты «вялікае дзякуй» ад гледачоў.

**Н. НОВІКАВА.**















На здымках: (злева направа) І. Юзафовіч, У. Бабенка, Л. Марозава, О. Бакшэева, С. Шкарупа, І. Троцкая і К. Паравознікаў. Фота **Д. Чаховіча.**

# З'ЯДНАНЫЯ ПЕСНЯЙ

«Человек над картою затих»... Спачатку ціха, не зусім упэўнена загучалі галасы. А потым мяккая і роўная мелодыя запоўніла залу. І яны, удзельнікі агітбрыгады, бачылі ўдзячныя твары прысутных, цёплыя ўсмешкі. Так пачаўся канцэрт агітбрыгады журфака ў адной з падшэфных воінскіх часцей.

Для іх стала добрай традыцыяй бываць з канцэртамі ў воінаў, у падшэфных школах. Вясёлы і добры Валодзя Субат, ціхая і задуменная Света Хорсун, рухавая і знаходлівая Анжэла Бярэйшык, разважлівы Валодзя Грэўцаў. Што аб'ядноўвае іх? Перш за ўсё — любоў да песні, жаданне дарыць людзям добры настрой...

Доўга не адпускалі са сцэны С. Будзько і А. Бярэйшык. Дзяўчаты спявалі песні «Там вдали, за рекой», «Давно знаю» і іншыя. Грэўцаў чытаў свае вершы, выканаў некалькі песень. Спадабаліся прысутным і песні С. Сверкунова «Спадчына», «Алеся» і іншыя.

На развітанне ўдзячныя гледачы жадалі артыстам-аматарам поспехаў, дзякавалі за добры канцэрт.

А. ПРЫЛІШЧ.

В. а. рэдактара
С. В. ГОВІН.

Наш адрас: г. Мінск, універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2.000 экз. Заказ 1415. АТ 03416